***методыка навучання мастацтву, калі навучэнец-пераемнік (пры непасрэдным кантакце) адсочвае і капіруе дзеянні майстра-настаўніка.*** На гэтым метадзе заснавана перадача сацыяльнага і мастацкага вопыту ў культурах вуснага тыпу, калі навучанне вядзецца «з голаса на голас» (навучанне спевам і аповеду) ці «з рукі на руку» (навучанне рамёствам і промыслам). Метад забяспечвае захаванне мастацкага стылю і тэхналогій творчасці, спрыяе фарміраванню субкультуры носьбітаў традыцыі. Такім чынам у Беларусі захоўваюцца традыцыі неглюбскага традыцыйнага ткацтва і веткаўскага іконапісу, цэнтральнабеларускай этнафоніі ў гурце «Калыханка» Міханавіцкага дома фальклору, цэнтральнабеларускай харэапластыкі ў мядоцкім гурце «Берагіня» і інш. Такі тып навучання з'яўляецца своеасаблівым «гарантам захавання аўтахтоннай культуры» і сёння суадносіцца з паняццем «нематэрыяльная культурная спадчына чалавецтва».

### ЛІТАРАТУРА

1. *Калацэй, В.* Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. – Мінск: Зорны верасень; Паркус плюс, 2009. – С. 13, 100.

## РЭВІТАЛІЗАЦЫЯ ЭТНАМАСТАЦТВА

**Рэвіталізацыя этнамастацтва** (ад *лац.* re- – аднаўленне і vita – жыццё, літаральна – **вяртанне жыцця**) – ***практычнае аднаўленне працэсу стварэння і дэманстрацыі элементаў этнічнага мастацтва ва ўмовах іх першапачатковага існавання (ландшафтавых і сацыяльна-культурных).*** Пры пісьмовай і паслядоўнай рэвіталізацыі спажыўцы мастацтва атрымліваюць, фактычна, аўтэнтычны і якасны прадукт творчасці носьбітаў традыцыі. Рэвіталізацыю практыкуюць, калі па нейкіх абставінах мастацкая традыцыя часова перарываецца (знікае ці ўваходзіць у схаваны, латэнтны стан). Час прыпынення мастацкай традыцыі можа быць розны – ад некалькіх гадоў (вяртанне да жыцця ў побыце народа дызайну і музыкі славацкай валынкі-гайды, неглюбскага тэкстылю) да некалькіх дзесяцігоддзяў (дызайн і музыка беларускай валынкі-дуды). Галоўная ўмова – наяўнасць субкультуры носьбітаў і пераемнікаў у аўтэнтычным асяродку бытавання элемента этнічнага мастацтва.

### ЛІТАРАТУРА

1. *Garaj, B.* Gajdyagajdošská tradíciana Slovensku. Bagpipeand Bagpipers Traditionin Slovakia / B. Garaj. – Bratislava: ASCO-Ústavhudobnej vedy SAV, 1995. – 277 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ